# Дынаміка рэпрэсіўнага ціску ў Беларусі

(асаблівасці 2025 года)

**Генадзь Коршунаў**

Беларуская сацыялагічная група

# Уводзіны

Маштабны ціск і бясконцыя рэпрэсіі – рэчаіснасць сучаснай Беларусі. Аб гэтым сведчыць кожная новая справаздача праваабаронцаў.

Апошнім часам рабіць паўнавартасны маніторынг рэпрэсіўнага ціску становіцца больш складана. З 2024 года беларускі рэжым адмовіўся ад дэманстратыўнасці ціску, а з 2025 года ўвогуле ўключыў рэжым «ціхіх рэпрэсій» – максімальнае прыхоўванне інфармацыі аб рэпрэсіях і пераслед за яе распаўсюд.

Агульную дынаміку ціску ўсё ж можна ацаніць. Для гэтага можна прааналізаваць тыя звесткі, што пакуль застаюцца адкрытымі: спісы "тэрарыстаў" і "экстрэмістаў", колькасць новых экстрэмісцкіх арганізацый і абнаўленні спісаў экстрэмісцкіх матэрыялаў (колькасць судоў і колькасць саміх матэрыялаў).

Калі да таго дадаць колькасць (сама)ліквідаваных НДА і  звесткі па новых палітвязнях

– атрымліваецца **7 паказнікаў**, дастатковых для разумення тэндэнцый рэпрэсіўнага ціску на беларускае грамадства.

# «Новыя» палітвязні

Пачынаючы з 2022 года колькасць «новых» палітвязняў зніжаецца кожны год.

У параўнанні з 2024-м у 2025-м годзе інтэнсіўнасць прызнання зняволеных палітвязнямі таксама знізілася: 593 супраць 448.

Аднак у нашым выпадку гэты **паказнік працуе не вельмі добра** – праз засцярогі сваякоў камунікаваць з праваабаронцамі і зацягнутасць працэдуры прызнання палітвязнямі.



# (Сама)ліквідацыя грамадскіх арганізацый

Ліквідацыя НДА запаволілася. Параўнанне з мінулагоднімі лічбамі паказвае зніжэнне на 74% (з 385 знішчаных за год да 107). Гэта максімальнае зніжэнне з усіх паказнікаў.

Такая лічба тлумачыцца вельмі проста – за папярэднія гады закрылі амаль усіх, хто, па меркаванню рэжыма, быў недастаткова лаяльнымі.

**Больш амаль няма каго ліквідаваць**.



# Суды па экстрэмісцкім матэрыялам

З другога квартала 2025 года колькасць судоў па «экстрэмісцкім матэрыялам» таксама пайшла на **зніжэнне** (хаця на гадавых лічбах гэта мала адбілася – -5%).

Зніжаецца і колькасць пазіцый, што атрымліваюць «экстрэмісцкі» статус за адно паседжанне.

Калі раней былі паседжанні, пад час якіх экстрэмісцкімі прызнавалі больш за 100 матэрыялаў, то зараз часцей працуе іншая логіка: адно паседжанне – адзін матэрыял.



# Новыя экстрэмісцкія матэрыялы

Тут мы назіраем той жа трэнд на зніжэнне.

Аналіз зместу матэрыялаў выкрывае прычыны такога зніжэння – **судам становіцца ўсё цяжэй** знаходзіць з'явы, якія можна аднесці да «экстрэмізма».

Доля асабістых старонак і хутчэй выпадковых пазіцый у 2025 годзе склала 44%, у 2023-м – 24%, у 2022-м – 15%.



# Новыя «экстрэміцкія» фармаванні

Прырост эстрэмістскіх фармаванняў таксама запаволіўся. Калі ў 2024 годзе такімі было прызнана 83 арганізацыі, то ў 2025 годзе – 58.

Гэтым годам экстрэмістамі прызнаваліся не толькі палітычныя і медыйныя праекты, але адукацыйныя платформы, сінктэнкі і – што паказальна – падструктуры ініцыятыў, прызнаных «экстрымістамі» раней.

І тут **з новым «экстремізмам» складана**.



# Новыя грамадзяне-«экстрэмісты»

Максімальная колькасць чалавек, прызнаных экстрэмістамі, была ў 2021 годзе – 2263. Надалей колькасць «новых» экстрэмістаў зніжалася кожны год: на 38%, 1% і 18% адпаведна.

У 2025 годзе экстрэмістамі былі прызнаны 1335 чалавек, а ў 2024 – 1146. То бок мінулым годам адбыўся першы прырост па гэтаму паказніку на 16%.

**Людзей-экстрэмістаў аказалася знайсці значана лягчэй,** чым арганізацыі ці інфармацыйныя матэрыялы.



# Новыя грамадзяне-«тэрарысты»

З 2022-га па 2024-ы гадавая колькасць «новых» тэрарыстаў вагалася паміж 156 і 172 чалавекамі. Мінулым годам тэрарыстамі прызналі 219 чалавек (прырост на 40%). Гэта максімальны паказнік за ўсе гады назірання.

Як і з экстрэмістамі, **прызначыць чалавека «тэрарыстам» вельмі проста**.



# Высновы

— **Колькасць палітвязняў** зараз не з'яўляецца універсальным індыкатарам жорсткасці рэпрэсій у Беларусі. Для аналізу дынамікі ціску неабходна выкарыстоўваць набор сектарных паказнікаў

— У шэрагу сфер **рэпрэсіўная палітыка наблізілася да стану насычэння**. Сфера НДА і лічбава-інфармацыйная прастора ў значнай ступені зачышчаныя і крыміналізаваныя, адсюль фармальнае зніжэння індыкатараў ціску. Такое зніжэнне не сведчыць пра змякчэнне рэпрэсіўнага курсу. Яно адлюстроўвае толькі вычарпанне патэнцыялу для пашырэння рэпрэсій

— **У сферах з неабмежаванай колькасцю аб'ектаў для ціску рэпрэсіі дасюль нарошчвацца**. Зараз гэта праяўляецца толькі ў росце колькасці новых «экстрэмістаў» і «тэрарыстаў» (іншыя паказнікі у гэтым кірунку схаваныя пад страхам сваякоў затрыманых і зняволеных)

— Трэба ўлічваць, што сферы права і правапрымянення захоўваюць сістэмна рэпрэсіўны характар

— Змяншаючыся ў адных сектарах і ўзмацняючыся ў іншых – **рэпрэсіі ў Беларусі трываюць**

# Дзякуй за ўвагу



**Генадзь Коршунаў**
сацыёлаг
сузаснавальнік БСГ

BELARUSIAN
SOCIOLOGICAL
GROUP
research initiative